**В. М. Дарошка,**
дацэнт кафедры педагогікі ГрДУ імя Янкі Купалы,
кандыдат педагагічных навук

**“Экалагічная педагогіка” як напрамак дзейнасці настаўніка ці вучэбны прадмет**

**Дадатак**

**ПРАГРАМА КУРСА “ЭКАЛАГІЧНАЯ ПЕДАГОГІКА”**

**Уводзіны**

**Мэта і задачы курса “Экалагічная педагогіка”. Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэмах педагагічных дысцыплін і падрыхтоўкі будучых настаўнікаў у ВНУ.**

## РАЗДЗЕЛ I
## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ СТАНАЎЛЕННЯ “ЭКАЛАГІЧНАЙ ПЕДАГОГІКІ”

### Тэма 1. “Экалагічная педагогіка” як вучэбная дысцыпліна.

Аб’ект і прадмет даследавання педагагічных дысцыплін экалагічнай педагогікі. Метадалагічныя асновы і метады экалагічнай педагогікі. Характарыстыка асноўных катэгорый экалагічнай педагогікі: экалагічная культура; чалавек; асоба; аб’ект і суб’ект выхавання, дзейнасці, культуры; фактары фарміравання асобы; сувязь чалавека і прыроды; органы пачуццяў; самаўсведамленне; індывідуальна-псіхалагічныя асаблівасці ўспрыняцця навакольнага асяроддзя. Іх характарыстыка з погляду традыцыйнай і экалагічнай педагогікі.

Асоба, індывід, індывідуальнасць, чалавек. Глабальнае, структурнае, працэсуальнае “Я”. Асаблівасці станаўлення кожнага ўзроўня чалавечага “Я”. Біясацыяльная сутнасць чалавека. Асоба і культура. Чалавек як спажывец і стваральнік культуры. Суадносіны агульнай культуры чалавецтва і экалагічнай культуры.

Асяроддзе як фактар фарміравання асобы. Структура асяроддзя: прыродна-біялагічны (глабальны), грамадскі (культурны) і асабісты (індывідуальны) узроўні. Асаблівасці ўплыву кожнага ўзроўню на фарміраванне асобы.

### Тэма 2. Метадалагічныя падыходы ў педагогіцы.

Метадалогія педагогікі. Прадмет даследавання. Функцыі метадалогіі педагогікі.

Метадалагічнае значэнне катэгорыі “асяроддзе” пры разглядзе пытанняў станаўлення асобы. Характарыстыка метадалагічных падыходаў па


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

дадзеным пытанні. Метадалогія марксізму-ленінізму, прагматызму, біхевіярызму, экзістэнцыялізму, валюнтарызму, неапазітывізму, неатамізму і інш.

Метадалогія марксізму-ленінізму. Мэта – фарміраванне ўсебаковай гарманічна развітой асобы. Вучань як аб’ект выхавання. Патрабаванні да асобы настаўніка. Крытэрыі адзнакі яго дзейнасці. Падыходы да адбору зместу адукацыі. Уплыў асяроддзя і выхавання на фарміраванне асобы і рашэнне задач камуністычнага выхавання.

Прагматызм. Асаблівасці адбору зместу адукацыі. Становчыя і адмоўныя бакі падыходу да адбору зместу адукацыі. Значэнне практыкі ў станаўленні чалавека. Роля ранняй дыферэнцыяцыі адукацыі. Магчымасць суадносін прагматызму і гуманістычнага погляду на развіццё асобы.

Валюнтарызм – напрамак, які вызначае вядучым у развіцці асобы волю. Роля суб’ектыўнай і аб’ектыўнай волі падчас станаўлення асобы. Асаблівасці паводзін настаўніка, які стаіць на пазіцыях валюнтарызму, і ўплыў яго асобы на выхаванне вучняў.

Экзістэнцыялізм у педагогіцы. Значэнне індывідуальных здольнасцей для арганізацыі працэсаў навучання і выхавання. Распрацоўка індывідуальных навучальных планаў і праграм. Метад тэсціравання, анкетавання, індывідуальнай гутаркі. Становчыя і адмоўныя бакі іх выкарыстання.

Біхевіярызм. Стымул, яго роля ў працэсе выхавання. Стварэнне сістэмы стымулаў пры арганізацыі дзейнасці вучняў. Метады пакарання і заахвочвання, асаблівасці іх выкарыстання. Роля самасвядомасці пры арганізацыі працэсу выхавання.

Неапазітывізм. Выкарыстанне пры навучанні ведаў, атрыманых падчас эксперыменту. Адсутнасць ідэалагічнага накірунку пры адборы зместу адукацыі. Асаблівасці вывучэння прадметаў на аснове самастойнага пошуку ведаў.

**Тэма 3. Альтэрнатыўная школа і педагогіка.**

Паняцце альтернатыўнасці школы і педагогікі. Крытэрыі і прыкметы альтэрнатыўных школ. Прынцыпы альтэрнатыўнасці. Характарыстыка асобных накірункаў альтэрнатыўных школ. Прычыны ўзнікнення альтэрнатыўных школ.

Семярхільская школа як школа свабодная ад пакарання, страху, прымусу. Асаблівасці ацэньвання вынікаў навучання. Агульнашкольны збор як метад самакіравання.

Школы Марыі Мантэсоры. Мэты і задачы навучання. Асноўныя прынцыпы работы: свабода выбару дзейнасці, самастойнасць, рознаўзроставасць вучняў аднаго класа, індывідуальнасць навучання, стварэнне выхаваўчага асяроддзя і г. д. Дыдактычны матэрыял, асаблівасці яго стварэння і выкарыстання. Асноўны лозунг школы: “Дапамажы мне гэта


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

зрабіць самому!” Патрабаванні да асобы настаўніка. Сучасныя школы М. Мантэсоры ў Беларусі.

Школы “Дыялога культур”. Мэта – фарміраванне не спажыўца, а стваральніка культуры. Асаблівасці навучальнай работы з улікам крызісаў развіцця вучняў. Метад пагружэння. Патрабаванні да арганізацыі ўрокаў і да асобы настаўніка. Магчымасць зближэння тэорыі і практыкі пры выкладанні прадметаў рознымі спецыялістамі.

Вальдорфская педагогіка – прыклад школ, якія арыентуюць дзейнасць на развіццё творчых здольнасцей асобы. Змест адукацыі, вучэбныя дысцыпліны мастацка-эстэтычнага цыкла як вядучыя пры фарміраванні асобы вучня.

Школа самаўсведамлення (А. Д. Каракоўскага). Стыль работы і жыцця школьнага калектыву. Самакіраванне. Школьны парламент. Функцыі адміністрацыі школы.

Асаблівасці рашэння задач экалагічнага выхавання ў кожнай з прыведзеных школ.

**Тэма 4. Дыялектыка станаўлення асобы.**

Характарыстыка працэсу станаўлення асобы і фактары яе развіцця.

Спадчыннасць. Задаткі як анатама-фізіялагічныя асаблівасці будовы чалавека, якія забяспечваюць станаўленне асобы.

Здольнасці як умова паспяховага выканання дзейнасці. Уплыў асяроддзя на развіццё здольнасцей. Сензітыўныя перыяды развіцця здольнасцей.

Асяроддзе як комплекс знешніх з’яў, якія стыхійна ўздзейнічаюць на чалавека. Геаграфічнае, дамашняе, сацыяльнае асяроддзе і г.д. Роль асобы падчас узаемадзеяння з асяроддзем. Пасіўны характар уздзеяння асяроддзя на станаўленне асобы. Структурныя кампаненты асяроддзя: глабальны, сацыяльны і індывідуальны ўзроўні. Сувязь паміж вызначанымі ўзроўнямі. Роля кожнага з іх у станаўленні асобы.

Выхаванне. Мэтанакіраваны, двухбаковы працэс узаемадзеяння двух і больш суб’ектаў (выхавацеля і вучня), пры якім фарміруюцца індывідуальныя якасці асобы.

Чалавек як сукупнасць прыроднага (жыццёвыя сілы) і сацыяльнага (грамадскія адносіны).

**Тэма 5. Працэс выхавання як фактар фарміравання асобы.**

Тэхналогія выхаваўчага працэсу. Супярэчнасць як рухаючыя сілы выхавання. Актыўны характар выхавання. Вызначэнне суб’ектаў выхаваўчага працэсу. “Патрабаванне” як змест індывідуальнай мэты выхавання.

Характарыстыка этапаў выхавання: вывучэнне ўзроўню выхаванасці; прад’яўленне патрабавання; фарміраванне адносін вучня да патрабавання;


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

арганізацыя практыкаванняў па выкананні патрабавання; фарміраванне прывычкі дзеяння; прад'яўленне новага, больш высокага патрабавання.

Вызначэнне значнасці этапа вывучэння ўзроўню выхаванасці школьніка. Зона актуальнага і бліжэйшага развіцця асобы.

Прад'яўленне патрабавання да вучня. Узровень прад'яўленага патрабавання. Узнікненне знешняй супярэчнасці. Прычыны, якія перашкаджаюць узнікненню знешняй супярэчнасці.

Фарміраванне адносін вучня да патрабавання. Узнікненне ўнутранай супярэчнасці. Аб'ектыўная і суб'ектыўная цяжкасць пераходу знешняй супярэчнасці ва ўнутраную. Роль асобы настаўніка ў дадзеным працэсе. Магчымасці змянення ўзроўню патрабавання і падзелу высокага патрабавання на паэтапныя састаўныя часткі.

Арганізацыя практыкаванняў па выкананні патрабавання. Вызначэнне неабходнай колькасці паўтораў практыкавання. Устанаўленне моманту дастатковасці паўтораў. Зняцце ўнутранай супярэчнасці. Своечасовасць зняцця кантролю за выкананнем патрабавання. Прывычка як паказчык дасягнення мэты выхавання.

Прад'яўленне новага, больш высокага патрабавання. Своечасовасць пастаноўкі новай задачы.

Недахопы ў працы настаўніка пры арганізацыі выхавання. Асаблівасці работы настаўнікаў з рознымі метадалагічнымі падыходамі.

## РАЗДЗЕЛ II
## ТЭОРЫЯ І МЕТОДЫКА ЭКАЛАГІЧНАЙ ПЕДАГОГІКІ

### Тэма 6. Узнікненне і развіццё экалагічнай культуры.

Сацыяльная сутнасць экалагічных праблем. Гісторыя развіцця кампанентаў экалагічнай культуры. Аналіз узаемаадносін грамадства і прыроды з пазіцый гісторыі развіцця характару і зместу самаўсведамлення асобы.

Перыядызацыя ўзаемаадносін грамадства і прыроды. Этапы зліцця чалавека з прыродай; вызначэнне чалавека як сацыяльнай сутнасці; прырода як першааснова ўсяго сутнаснага; усведамленне чалавекам сваіх сіл і магчымасцей змяніць прыроду.

Адносіны чалавека да прыроды як крыніцы задавальнення патрэбнасцей грамадства. Утылітарныя каштоўнасці прыроды. Устанаўленне парэсурснай аховы прыродных багаццяў.

Ператварэнне рэгіянальных экалагічных праблем у глабальныя. Пагроза ўзнікнення глабальнага экалагічнага крызісу. Развіццё руху па ахове прыроды. Асаблівасці прыродаахоўнай дзейнасці.

Узнікненне экалогіі як навуковай дысцыпліны. Узнікненне сацыяльнай экалогіі, экалогіі чалавека, экалогіі культуры і інш. Станаўленне экалагічнай культуры адносін чалавека да прыроды, іншых людзей і самога сябе.


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

**Тэма 7. Асаблівасці ўплыву сацыяльнага асяроддзя на станаўленне экалагічнай культуры асобы.**

Сучасная цывілізацыя і развіццё экалагічнай культуры. Характарыстыка механізму ўздзеяння фактараў цывілізацыі на станаўленне індывідуальнай экалагічнай культуры.

Асаблівасці цывілізацыі, якія аказваюць негатыўны ўплыў на развіццё экалагічнай культуры асобы. Праяўленне іх дзеяння ў школьным асяроддзі. Перанасельніцтва. Вялікае напаўненне класаў, страта здольнасцей чулых адносін да іншых людзей. Адарванасць чалавека ад прыроды. Вывучэнне законаў прыроды па кнігах, без непасрэднага ўзаемадзеяння з прыродай. Павелічэнне шляху паміж спажыўцом і крыніцай задавальнення патрэбнасцей. Адсутнасць эмацыянальнага ўспрымання прыроды.

"Бег чалавека наперагонкі з самім сабой" – патрабаванні, якія пастаянна павялічваюцца і не маюць разумовых межаў. "Цеплавая смерць" чалавека як яго залежнасць ад бытавых умоў жыцця. Гэта павялічвае рызыку фарміравання асобы, якая не мае сіл процістаяць цяжкасцям жыцця.

Генетычная дэградацыя вынікае падчас высокага ўзроўню аховы здароўя, што павялічвае рызыку захавання негатыўных прыкмет у генатыпе чалавека. Умешванне чалавека ў натуральны адбор як сярод хатніх жывел (селекцыя), так і сярод людзей (медыцына, яўгеніка).

Разрыў традыцый – аддаленне дзяцей і бацькоў. Адыход ад традыцыйнага сямейнага стылю жыцця. Індакрынацыя – абсалютнае, некрытычнае прыняцце слоў настаўніка як ісціны ў апошняй інстанцыі.

Меры па змяншэнню адмоўнага ўплыву вызначаных прыкмет цывілізацыі на станаўленне асобы вучня.

**Тэма 8. Крытэрый і паказчыкі экалагічнай культуры.**

Крытэрыі экалагічнай культуры. Крытэрый як мера вымярэння. Розныя падыходы да іх вызначэння.

Характарыстыка "адносін" як крытэрыя экалагічнай культуры, як асновы тыпізацыі.

Паказчыкі экалагічнай культуры: адносіны да прыроды, адносіны да іншых людзей, адносіны да самога сябе.

Прыкметы экалагічнай культуры. Змястоўнае раскрыццё прыкмет праз універсаліі: "Я", "не-Я", адносіны паміж "Я" і "не-Я", класіфікацыя другога, прычэпнасць, час, прастор.

Характарыстыка прыкмет трох паказчыкаў экалагічнай культуры. Прыкметы паказчыка "адносіны да сябе": сфарміраванасць самасвядомасці і ўзроўню самаадзнак, і значнасць іншага для развіцця "Я", для самарэалізацыі; "не-Я" і жыццёвая прастора, месца "Я" ў ім; "Я" і час; "Я" – актыўны суб'ект ці ахвяра абставін – прычэпнасць.

Прыкметы паказчыка “адносіны да іншых людзей”: сфарміраванасць ведаў пра грамадства і іншых людзей; характарыстыка соцыуму; узаемадзеянне з іншымі людзьмі; характар сацыяльнага асяроддзя; экалагічнае прагназаванне; узровень развіцця экалагічнай культуры грамадства.

Прыкметы паказчыка “адносіны да прыроды”: паняцце прыроды як кампанента сістэмы “прырода – чалавек”; пачуццёвае ўспрыманне прыроды; навакольнага асяроддзя; структура экалагічных сістэм; стварэнне штучнай экалагічнай сістэмы; прырода як крыніца творчай дзейнасці; асваенне прыроды чалавекам; уплыў прыроды на развіццё грамадства.

**Тэма 9. Тыпалогія экалагічнай культуры.**

Тыпалогія як метад класіфікацыі. Тыпалогія пры аналізе індывідуальнай экалагічнай культуры.

Характарыстыка асноўных тыпаў экалагічнай культуры: тып зліцця; тып асабістай дастатковасці; экалагічнага аптымізму; экалагічнага песімізму; абсалютызацыі экалагічных ведаў; экалагічнай гармоніі.

Тып зліцця, адносіны да прыроды як асноўнага фона жыцця, характар дзейнасці з улікам магчымасці прыроды. Усведамленне сябе як часткі прыроды.

Тып асабістай дастатковасці. Адносіны да сябе як галоўнай фігуры свету. Асабістыя інтарэсы з’яўляюцца асноўным крытэрыем дзейнасці чалавека. Іншыя людзі павінны думаць пра сябе самі. Прырода – крыніца дабрабыту. Эгацэнтрычны погляд на рэчаіснасць.

Тып экалагічнага аптымізму. Грамадства адказна за парушэнне экалагічнай раўнавагі, але гэта часовыя цяжкасці. Чалавек здолее знайсці выхад з дадзенай сітуацыі. Прырода не можа знішчыць чалавека. Тып экалагічнага песімізму. Для вырашэння існуючых экалагічных праблем чалавек павінен адмовіцца ад выкарыстання прыродных каштоўнасцей, “зменшыць свае апетыты”. Інакш экалагічная катастрофа непазбежна.

Тып абсалютызацыі экалагічных ведаў. Вера ў тое, што экалагічныя веды зменяць існуючую сітуацыю. Масавая экалагічная граматнасць станоўча паўплывае на паводзіны людзей, веданне экалагічнай этыкі забяспечыць правільныя адносіны да прыроды, устанаўленне гарманічных адносін грамадства да прыроды.

Тып экалагічнай гармоніі. Паважныя адносіны як да прыроды, так і да сябе самога і іншых людей. Экалагічная прастора чалавека. Устанаўленне гармоніі ў адносінах да ўсяго, што акружае чалавека. Сацыяльны характар экалагічнай культуры.

Дыягностыка сфарміраванага тыпу экалагічнай культуры.

**Тэма 10. Узроставыя асаблівасці станаўлення экалагічнай культуры.**


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

Узроставыя асаблівасці асобы, псіхічнае і фізіялагічнае развіццё, іх сувязь з тыпам экалагічнай культуры.

Перыяд малодшага школьнага ўзросту – сензітыўны перыяд станаўлення эмацыянальнага ўспрымання прыроды. Асаблівасці самасвядомасці, адносін да іншых людзей. Найбольш тыповыя асобасныя рысы і якасці малодшага школьніка. Сфарміраванасць адносін да навакольнага асяроддзя.

Перыяд 9 – 14 гадоў. Умовы станаўлення самасвядомага ўзаемадзеяння з прыродай і людзьмі. Сфарміраванасць міжасобасных адносін. Асобасныя цэннасці дзіцяці.

Узроставая група 14–17 гадоў – перыяд станаўлення суб’ект-суб’ектных адносін. Адказнасць у дзяцей. Арыентацыя на будучыню. Адсутнасць абсалютнага ідэалу.

Дыягностыка тыпаў экалагічнай культуры. Праектыўныя методыкі. Патрабаванні да анкет, якія вызначаюць тып экалагічнай культуры старшакласнікаў.

**Тэма 11. Развіццё тэорыі экалагічнага выхавання.**

Станаўленне экалагічнага аспекту выхавання (прыродаахоўнае выхаванне, экалагічная адукацыя і г. д.).

Ж.-Ж.Русо, І.Г.Песталоцці, Ф.А.Дыстэрвег, А.І.Герцэн, К.Дз.Ушынскі і інш. пра ролю прыроды ў справе выхавання падрастаючага пакалення.

Выхаванне адказных адносін да прыроды як мэта экалаічнага выхавання. Праграма экалагічнага выхавання (1977). Міжнародныя дакументы і доўгатэрміновыя праграмы рашэння задач экалагічнага выхавання. Шляхі іх рэалізацыі.

Характарыстыка недахопаў сучасных падыходаў да экалагічнага выхавання і адукацыі школьнікаў. Абсалютызацыя паняцця “экалогія”, перабольшвання развіцця разумовай сферы асобы з уронам у сферы эмацыянальнай. Абмежаванасць праграм рашэння экалагічных праблем мінулым вопытам. Фрагментарнасць экалагічных ведаў у школьнай адукацыі. Арганізацыя экалагічнай адукацыі і выхавання ва ўмовах адсутнасці выбару.

Адукацыя для трывалага развіцця. Экалагічны аспект адукацыі для трывалага развіцця. Праграмы ЮНЕСКО і ЮНЭП па арганізацыі адукацыі для трывалага развіцця.

Характарыстыка сучасных канцэпцый экалагічнай адукацыі і выхавання.

**Тэма 12. Канцэпцыя экалагічнага выхавання.**

Метадалогія экалагічнага выхавання. Мэта і задачы.

Асноўныя заканамернасці: сувязь працэсу фарміравання экалагічнай культуры тыпу гармоніі са свабодай вучня ў выбары характару і зместу дзейнасці; з творчым падыходам да выканання задач навучання і выхавання;


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

са сфарміраванасцю ўсвядомленай індывідуальнай экалагічнай просторы вучня, уключаючы як знешнюю, так і ўнутраную прастору праз самавызначэнне, самадзейнасць, са сфарміраванасцю пачуцця дачынення да ўсяго, што адбываецца навакол; з максімальным засваеннем навакольнага асяроддзя, у суадноснасці яго са здольнасцямі, цікавасцямі, патрабаваннямі вучня; з фарміраваннем уменняў арганізацыі сваёй жыццёвай прасторы; з узроставымі псіхалагічнымі асаблівасцямі.

Сувязь экалагічнага і іншіх накірункаў выхавання.

Прынцыпы экалагічнага выхавання. Дзве групы прынцыпаў: першая – агульнадыдактычныя; другая – характарызуе толькі экалагічнае выхаванне. Характарыстыка прынцыпу адзінства пазнавальнай і практычнай дзейнасці падчас вывучэння і паляпшэння прыроднага асяроддзя; прынцып кампліментарнасці, інакш кажучы, дапаўнення; прынцып выкарыстання функцыі навучання, выхавання і развіцця прыроды; прынцып узаемасувязі глабальнага, нацыянальнага, краязнаўчага і асобаснага падыходаў; прынцып творчай каардынацыі зместу экалагічнага выхавання; прынцып уліку псіхалагічных асаблівасцей развіцця ўспрымання і самасвядомасці школьніка.

Падыход да адбору зместу экалагічнай адукацыі з улікам асноўных паказчыкаў экалагічнай культуры.

Культура адносін да прыроды; развіццё і цэласнасць прыроды ў сферы жыцця; ўзаемасувязь прыроды і грамадства. Змяненне прыроды ў працэсе працы; залежнасць характару ўзаемадзеяння чалавека і прыроды ад узроўню экалагічнага развіцця; асяроддзе і здароўе чалавека; прафесіянальнае выкарыстанне прыроды.

Культура адносін да іншых людзей: узаемаабумоўленасць навукова-тэхнічнага развіцця і ўзроўню патрабаванняў грамадства; праблема утылізацыі і ачышчэння адыходаў вытворчасці. Удасканаленне прыроды: стварэнне штучнага клімату, сістэмы арашэння, асушэнне балот і г. д. Псіхалагічнае здароўе людзей ва ўмовах штучнага асяроддзя. Развіццё экалагічна чыстых тэхналогій. Прагназаванне ўплыву дзейнасці чалавека на іншых людзей і на сябе.

Культура адносін да самога сябе: прырода ў маральна-эстэтычным развіцці асобы; аб’ектыўнае ўспрыманне рэчаіснасці; прыняцце сябе, іншых людзей і прыроды. Залежнасць развіцця асобы ад культуры і асяроддзя; сфарміраванасць грамадскай цікавасці; дэмакратычны характар міжасобасных адносін. Здольнасць да творчасці (крэатыўнасць); сфарміраванасць суб’ектыўнага вопыту; сфарміраванасць цэласнай жыццёвай філасофіі.

**Тэма 13. Магчымасці экалагічнага выхавання ў сучасных умовах.**

Комплексная экалагізацыя зместу адукацыі як асноўны метад фарміравання экалагічнай культуры ў сучаснай школе. Экалагічныя аспекты


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

вучэбных прадметаў школьнага цыкла ("Чалавек і свет", "Батаніка", "Хімія", "Фізіка", "Літаратура", "Гісторыя" і г. д.)

Увядзенне новых вучэбных дысцыплін: "Радыяцыйная бяспека", "Экалогія", "Уводзіны ў экалогію" і г. д.

Пазаўрочная выхаваўчая работа: эколага-геаграфічныя экскурсіі, стварэнне экалагічных пашпартоў, экалагічны маніторынг, арганізацыя экалагічна значнай дзейнасці. Устанаўленне экалагічнага тыпу школы, ВНУ і г. д. Арганізацыя экалагічнага выхавання ў дзіцячых пазашкольных установах.

Найбольш тыповыя цяжкасці ажыццяўлення экалагічнага выхавання. Прыродаахоўны напрамак экалагічнага выхавання. Падыход да аховы прыроды з пазіцый парэсурснага збераджэння. Адсутнасць увагі да аховы чалавека, яго адносін да сябе і іншых людзей.

## РАЗДЗЕЛ III. ЭКАЛАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА НАСТАЎНІКА

### Тэма 14. Тыпалогія экалагічнай культуры настаўніка.

Узровень культуры асобы настаўніка. Уплыў тыпу экалагічнай культуры настаўніка на характар адносін з вучнямі і калегамі, на стыль прафесіянальнай дзейнасці.

Характарыстыка тыпаў экалагічнай культуры настаўнікаў: асабістай дастатковасці; экалагічнага аптымізму; экалагічнага песімізму; абсалютызацыі экалагічных ведаў; экалагічнай гармоніі.

Дыягностыка экалагічнай культуры настаўніка. Вылучэнне характару адносін да прыроды як крыніцы асноўных ведаў, інфармацыі і зместу выхавання. Адносіны да іншых людзей – з пазіцыі адносін настаўніка да вучняў. Адносіны да сябе як да педагога.

### Тэма 15. Уплыў сфарміраванасці экалагічнай культуры настаўніка на навучальна-выхаваўчы працэс.

Уплыў асаблівасцей адносін настаўніка да сябе, вучняў і прыроды на эфектыўнасць выхаваўчай работы ў школе.

Характар адносін настаўніка да вучня: развіццё асобы школьніка, развіццё самастойнасці, эмацыянальнае і рацыянальнае развіццё асобы школьніка, развіццё органаў пачуццяў падчас адукацыі і выхавання.

Рэпрадуктыўная адукацыя і выхаванне, характар творчых заданняў, магчымасць выкарыстання прыроды ў працэсе адукацыі.

Заніжаная самаацэнка вучняў як вынік недаацэнкі асобы школьніка педагогам. Індывідуальны падыход да адукацыі і выхавання. Магчымасць выхавання пачуццяў. Выхаваўчая прастора школы. Адчужэнне ад прыроды ў працэсе выхавання і навучання.

Шляхі пераадольвання цяжкасцей экалагічнага выхавання.


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

**Тэма 16. Падрыхтоўка студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей да экалагічнага выхавання школьнікаў.**

Змест падрыхтоўкі будучых настаўнікаў да экалагічнага выхавання школьнікаў.

Структура экалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў. Роля асноўных відаў дзейнасці  пры падрыхтоўцы будучага настаўніка да экалагічнага выхавання.

Асаблівасці экалагічнай культуры ВНУ. Узроўні экалагічнай прасторы ВНУ. Уплыў кожнага з узроўняў на стварэнне экалагічнай культуры студэнта.

Неабходнасць авалодання падчас навучання ў ВНУ ўменнямі правядзення экалагічнага выхавання: вызначаць экалагічныя веды ў змесце ўсіх вучэбных дысцыплін; арганізаваць экалагічна апраўданыя адносіны з прыродай; дыягностыкі тыпу экалагічнай культуры асобы; выкарыстоўваць прыроду як крыніцу ведаў па сваім прадмеце; вывучаць асабістую экалагічную прастору школьніка; уключаць у гэтую прастору адносін і прадметы, якія забяспечваюць станаўленне экалагічнай культуры тыпу гармоніі; уменне бачыць прыгажосць прыроды і чалавека і г. д.

РАЗДЗЕЛ IV. АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЭСУ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ З УЛІКАМ ПАТРАБАВАННЯЎ РАЗВІЦЦЯ ЭКАЛАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ АСОБЫ ВУЧНЯ

**Тэма 17. Структура працэсу засваення ведаў.**

Цэласнасць працэсу засваення ведаў. Характарыстыка тэхналогіі вывучаемага працэсу: успрыманне – разуменне – запамінанне – абагульненне – прымяненне.

Успрыманне падраздзяляецца на адчуванне, асабістае ўспрыманне і ўяўленне. Умовы паспяховасці эмпірычнага пазнання. Магчымасць кіравання “жывым сузіраннем”. Уяўленне як пачуццёва-наглядны абагульнены вобраз прадметаў і з’яў, які захоўваецца і аднаўляецца ва ўсведамленні і без непасрэдняга ўплыву прадмета і з’яў на органы пачуццяў, ажыццяўляецца ў выглядзе вобразаў памяці і ўяўлення. Паняцці, суджэнні, вывады.

Разуменне. Прыкметы разумення. Элементы разумення: усведамленне, асэнсаванне, інсайт. Сувязь паміж працэсамі ўсведамлення і пазнавання.

Запамінанне: першаснае, бягучае, замацаванне. Працэсы абагульнення і сістэматызацыі. Першаснае абагульненне, лакальнае (частковае ці паняційнае). Фарміраванне паняцця. Міжпаняційныя (пазаўрочныя) і тэматычныя абагульненні. Выніковае і паміжкурсавое ці паміжпрадметнае абагульненне.

Сувязь узросту вучня і щвагі настаўніка да розных этапаў засваення ведаў.

**Тэма 18. Тэхналогія працэсу фарміравання ўменняў.**


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

Характарыстыка паняццяў “уменне” і “навык”, суадносіны і асаблівасці фарміравання.

Практыкаванне як сродак фарміравання ўменняў. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі практыкаванняў пры фарміраванні ўменняў.

Сістэма практыкаванняў пры фарміраванні ўменняў. Віды практыкаванняў і іх дыдактычныя мэты. Характарыстыка ўводных, падрыхтоўчых, пробных, трэніровачных, творчых і кантрольных практыкаванняў пры фарміраванні ўменняў.

Значэнне дзейнасці педагога ў падборы і вызначэнні паслядоўнасці выканання практыкаванняў пры фарміраванні ўмення самастойна рашаць задачы.

**Тэма 19. Фарміраванне калектыву на ўмовах самакіравання.**

Паняцце аб калектыве. Прыкметы калектыву. Структура калектыву. Асаблівасці адносін асобы і калектыву, палажэнне асобы ў калектыве. Зоркі, ізгоі і інш.

Фарміраванне калектыву на ўмовах самакіравання вучняў. Стадыі развіцця самакіравання ў калектыве. Прыкметы пераходу ад адной стадыі развіцця самакіравальнага калектыву да другой і трэцяй. Прад’яўленне патрабаванняў і характар кантролю за іх выкананнем.

Актыў класа. Яго функцыі. Роль актыву пры развіцці самакіравання ў калектыве вучняў. Настаўнік як член калектыву, асаблівасці яго ўспрымання вучнямі.

Прынцыпы развіцця самакіравання ў школьным калектыве: прынцып пашырэння паўнамоцтваў, прынцып драблення, прынцып змены паўнамоцтваў.

Умовы паспяховага развіцця самакіравання: самастойнасць, аўтаномнасць, двайны кантроль, інфармаванасць, кампетэнтнасць, карэкцыя па адхіленнях, ацэнка па канчатковаму выніку.

Асаблівасці педагагічнай дзейнасці пры фарміраванні калектыву.

**Тэма 20. Арганізацыя дзейнасці вучняў падчас выхавання.**

Асноўныя віды дзейнасці, якія арганізуе настаўнік з вучнямі пры выхаванні. Агульнаметадычныя патрабаванні да арганізацыі дзейнасці школьнікаў: наяўнасць дзвюх мэт (прадметнай і выхаваўчай), веданне аб’ёму і сродкаў выканання дзейнасці.

Характарыстыка асобных відаў дзейнасці і форм арганізацыі: пазаўрочная пазнавальная дзейнасць, мэта і задачы. Асноўныя формы арганізацыі: вусны часопіс, агляд перыядычнай і навукова-папулярнай літаратуры.

Каштоўнасна-арыентаваная дзейнасць. Інструментарый дадзенага віду дзейнасці. Патрабаванні да арганізацыі і правядзення класных гадзін. Неабходнасць асобасна-каштоўнаснага прадмета гаворкі для вучняў.


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

Грамадска-каштоўная дзейнасць як сродак вахавання альтруізму асобы. Патрабаванне ўключэння вучняў у сапраўдную грамадскую дзейнасць. Выкарыстанне метадаў грамадскай пахвалы лепшых вучняў.

Фізкультурна-аздараўленчая дзейнасць. Асноўныя мэты. Характарыстыка форм і метадаў ажыццяўлення: дзень здароўя, спартакіяды, фізкультхвілінкі і г. д.

Мастацка-творчая дзейнасць. Развіццё творчых здольнасцей вучняў. Мастацкая самадзейнасць, конкурсы і іншыя формы яе арганізацыі. Умовы развіцця творчых здольнасцей.

Вытворчая праца. Работа навучальна-вытворчага камбіната. Прафесянальная арыентацыя. Дапамога пры вызначэнні спецыялізацыі ў 10–11 класах.

Свабодныя зносіны. Мэта – сфарміраваць адносіны аднаго вучня да другога ў адпаведнасці з тым, як яны патрабуюць, каб адносіліся да іх. Арганізацыя адносін падчас перапынкаў між урокамі, на дыскатэках, у кіно, тэатры, на вуліцы і г. д. Правядзенне дня імянінніка, ласуна, вечарын і г. д.

**Тэма 21. Арганізацыя калектыўнай творчай справы.**

Арганізацыя калектыўнай творчай справы. Стадыі КТС: папярэдняе планаванне, калектыўнае планаванне, падрыхтоўка мерапрыемства, падвядзенне вынікаў.

Папярэдняе планаванне – неабходна для вызначэння інтарэсаў вучняў, асоб, здольных выканаць асноўныя патрабаванні. Узаемадзеянне на гэтай стадыі настаўніка і актыву класа. Калектыўнае планаванне, падчас якога вызначаюцца ўсе віды дзейнасці, неабходныя для правядзення творчай справы, а затым адказныя за іх выкананне.

Падрыхтоўка мерапрыемства – самы працяглы этап, эфектыўнасць якога залежыць ад пазіцыі настаўніка. Неабходна ажыццяўляць жорсткі кантроль за ходам падрыхтоўкі і ў той жа час не прыгнесці жаданне вучняў працаваць. Правядзенне мерапрыемства – вынік працы на папярэдніх этапах. Неабходнасць самастойнасці вучняў на гэтым этапе.

Падвядзенне вынікаў – патрабуе адзнакі ўсіх без выключэння асоб, якія прымалі ўдзел у правядзенні і падрыхтоўцы мерапрыемства.

Характарыстыка асаблівасці паводзін настаўніка на кожнай з вызначаных стадый. Пашырэнне магчымасцей самастойнай працы вучняў пры арганізацыі КТС.

**Літаратура**

1. Бачинский, Г. А. Социоэкология: теоретические и прикладные аспекты / Г. А. Бачинский. – Киев: Наукова думка, 1991.
2. Глазачев, А. Н. Экологическая культура учителя/ А. Н. Глазачев. – М.: Совр. писатель, 1998.


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

3. Глазачев, С. Н. Экологическая культура / С. Н. Глазачев, О. Н. Козлова. – М., 1997.

4. Комплексная программа непрерывного педагогического образования и воспитания детей дошкольного и школьного возраста/ред. В. И. Иванова, О. М. Дорошко, В. А. Бахарев, С. С. Маглыш, А. Н. Пушкарский и др. – Гродно: ПиК, 1996.

5. Дорошко, О. М. Экологическая культура: педагогический аспект / О. М. Дорошко.– Гродно: ГрГУ, 2001.

6. Дорошко, О. М. Экологическая педагогика: учебное пособие / О. М. Дорошко. – Гродно: ГрГУ, 2002.

7. Дорошко, О. М. Экологическое воспитание школьников: уч. пособ. по курсу «Педагогика и методика воспитательной работы» для студентов педагогических специальностей / О. М. Дорошко.– Гродно: ГрГУ, 1994. –

8. Железнов, Ю. Д. Человек в природе и обществе. Введение в эколого-философскую антропологию / Ю. Д. Железнов.– М.: Изд-во МНЭПУ, 2001.

9. Зубра, А. С. Культура личности как духовная ценность / А. С. Зубра.– Минск, 2001.

10. Канцэпцыя экалагічнага выхавання школьнікаў у Беларусі [Праект] // Адукацыя і выхаванне. – 1993. – №11. – С.20–34.

11. Каропа, Г. Н. Системный подход к экологическому образованию и воспитанию (на материалах сельских школ) / Г. Н. Каропа. – Минск.: Універсітэцкае, 1994.

12. Концепция образования и воспитания в Беларуси / под ред. В. П. Пархоменко. — Минск.: Ред журн. «Адукацыя і выхаванне». 1994.

13. Котович, Н. К. Экологическое воспитание школьников: программа и опыт/ Н. К. Котович, М. А. Станчиц.– – Минск: НИО, 1993.

14. Лоренц, К. Восемь сметных грехов цивилизованного человечества / К. Лоренц. – М., 2000.

15. Межправительственная конференция по вопросам образования по окружающей среде. – Тбилиси // Контакт. Бюллетень ЮНЕСКО. ЮНЕП. – 1977. – Т. 2. – №2.

16. Мясищев, В. Н. Психология отношения / В. Н. Мясищев. – Воронеж: АПСН, 1995.

17. Новые педагогические технологии в экологическом образовании: методические материалы. — Минск, 1997.

18. Проблемы экалогіі культуры і духоўнасці: матэр. міжнар. навук.-творч. канф. Мінск, 25–26 лютага, 1997 / Навук. рэд. Я. Ф. Канапля, А. І. Мікулуч. — Минск, 1997.

19. Тейяр де Шарден П. Феномен человека / Тейяр де Шарден. – М.: Прогресс, 1989.


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf

20. Церахаў, Я. Праграма і метады выкладання экалогіі ў школе / Я. Церахаў, Л. Церахава, С. Старавойтава, А. Аношкин // Настаўніцкая газета. – 1993. – 30 чэрвеня. – С. 3.

21. Черноушек, М. Психология жизненной среды / М. Черноушек. – М.: Прогресс, 1984.

22. Экологические и социокультурные аспекты устойчивого развития: сб. ст./под ред. П. А.Водопьянова. – Минск: Ин-т философии и права АНБ, 1997.

23. Экологическое воспитание учащихся: метод. рекомендации. – Гомель, 1989.

24. Экологическое образование в школе: концепция / И. Д. Зверев, И. Т. Суравегина, Т. В. Кучер и др. – М.: МЦМ и СЩ, 1994.

25. Экопедагогика: состояние, проблемы, перспективы: матер. междунар. конф.– Минск, 1995.

26. Экопедагогика: состояние, проблемы, предложения // Пазашкольнае выхаванне. – 1998. – № 1. – С. 49 – 51.


© «Народная асвета», 2006, №12: www.n-asveta.com\dadatki\daroshka.pdf